СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*IV квартал*
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 ЖНІЎНЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 168
(26776)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАСКРЫТЫКАВАЎ РАБОТУ ДЗЯРЖОРГАНАЎ ПА ВЫКАНАННІ ВАЖНЕЙШЫХ ПАРАМЕТРАЎ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Учора Урад і Нацыянальны банк далажылі кіраўніку дзяржавы аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Прагучалі і прагнозы, і планы на будучую пяцігодку. Аляксандр Лукашэнка жорстка раскрытыкаваў некаторыя з іх.

Фота БЕЛТА.

Нягледзячы на тое, што ў студзені—ліпені забяспечана станоўчая дынаміка асноўных макраэканамічных паказчыкаў, пакуль выконваюцца толькі 2 з 19 важнейшых параметраў прагнозу на 2010 год. Не дасягнута намечанае ні па прамысловай вытворчасці, ні па выпуску сельгаспрадукцыі, ні па інвестыцыях у асноўны капітал... У выніку тэмп росту ВУП складае 107 працэнтаў пры прагнозе 111—113.

«Ад таго, з якімі вынікамі мы падыдзем да канца пяцігодкі, будзе залежаць, як мы будзем трымаць справаздачу перад беларускім народам за рэалізацыю рашэнняў трэцяга Усебеларускага народнага сходу, за выніковасць прынятых намі мераў па паляпшэнні якасці жыцця насельніцтва. За ўсё, што было намі абяцана», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць нездавальняючай работу дзяржорганаў па прыцягненні ў эканоміку краіны прамых замежных інвестыцый. Ён адзначыў незбалансаванасць у знешнім гандлі і нізкую дэверсіфікацыю экспарту. За 6 месяцаў гэтага года адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі сфарміравалася ў суме $2,4 млрд.

Не выканана даручэнне кіраўніка дзяржавы па разгрузцы складоў — дагэтуль там знаходзіцца гатовай прадукцыі на 6 трл рублёў. Ад вырашэння праблемы залежыць фінансавае становішча рэальнага сектара эканомікі.

Аднак не лепшы спосаб вырашыць гэтую праблему адгрузкай прадукцыі без аплаты. Такім чынам яна пакідае беларускія склады і асядае на складах дылераў. У выніку такой схемы толькі пратэрмінаваная запазычанасць расійскіх партнёраў перавысіла доўг беларускіх прамысловых прадпрыемстваў на 347 млрд рублёў, ці ў чатыры разы! Гэта значыць, што карысць ад росту экспарту і разгрузкі складоў маюць не беларускія вытворцы, а іх знешнегандлёвыя партнёры.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў цэнтры справаздач Урада і Нацбанка павінна стаяць найважнейшая задача — павышэнне канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, у вырашэнні якой ключавая роля належыць інавацыям.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся сітуацыяй на валютным рынку краіны. Набыццё перавышае продаж амаль на 3 млрд долараў.

«Фактычна сёння мы маем адмоўнае сальда з боку суб'ектаў гаспадарання. Калі раней прадпрыемствы з'яўляліся асноўнымі пастаўшчыкамі валюты, то цяпер становішча змянілася акурат да наадварот», — сказаў ён.

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі сярод «тонкіх» месцаў звярнуў увагу кіраўніка дзяржавы на няўстойлівае становішча валаўтаральных прадпрыемстваў. Паводле яго слоў, станоўчая дынаміка ёсць, аднак Урад прапануе падтрымаць вытворцаў дадатковымі крэдытамі.

Увогуле на долю прамысловых прадпрыемстваў прыпадае амаль 40 працэнтаў агульнай колькасці стратных прадпрыемстваў. За першае паўгоддзе стратнымі было 300 падпрыемстваў.

Прэзідэнт жорстка крытыкаваў утрыманства, да якога прызвычаіліся некаторыя кіраўнікі. Выдаткаванне крэдытаў, якія не вяртаюцца, не дапушчальна, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, ёсць праблемы і ў сельскай гаспадарцы. Прычым не толькі ў раслінаводстве, якое пацярпела з-за надвор'я. Адзначаецца зніжэнне тэмпаў вытворчасці па ўсіх таварных групах. Разам з тым рост валавай прадукцыі склаў 108,4 працэнта. А чыстыя страты за паўгоддзе атрымалі 23 сельскагаспадарчыя арганізацыі ці 1,4 % ад агульнай колькасці.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу прысутных, што неабходна максімальна эфектыўна скарыстацца кан'юнктурай цэнаў на сельгаспрадукцыю на замежных рынках. Паводле яго слоў, кілаграм бульбы мы ўжо прадаём ледзь не за паўдолара. Калі не спаць у шапку, можна «азалаціцца». Нават салому расіянам прадаём. І ў бліжэйшай перспектыве сітуацыя на рынках наўрад ці зменіцца.

Што датычыцца інвестыцыйнай работы, то Урад упэўнены ў выхадзе да канца года на вызначаныя аб'ёмы. У хуткім часе будуць запушчаныя яшчэ 76 інвест-праектаў.

Апошнім часам шмат увагі Урад надае развіццю малога і сярэдняга бізнэсу.

«Лічу, што гэтымі пытаннямі больш павінны займацца ў рай- і гарвыканкамах, — адзначыў Сяргей Сідорскі. — На жаль, мы топчамся на месцы. Чыноўнікі забюракратызавалі гэтыя пытанні. Няма жывой работы і той аддачы, якую мы плануем атрымаць ад малога бізнэсу ў рэгіёнах».

Рэальная заработная плата за 7 месяцаў павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года на 9,4 працэнта і склала 427 долараў ЗША ў эквіваленце. Ніжэй сярэднерэспубліканскага ўзроўню ў ліпені яна заставалася ў арганізацыях сацыяльнага забеспячэння (754 тыс. рублёў), адукацыі (842 тыс.), установах культуры і мастацтва (910 тыс.), сельскай гаспадарцы (923 тыс.), аховы здароўя (1000 тыс.), лясной гаспадаркі (1101 тыс.), жыллёва-камунальнай гаспадаркі (1121 тыс.), гандлю і грамадскага харчавання (1126 тыс. рублёў). Разам з тым Урад ужо намеціў шляхі давядзення сярэдняга заробку да вызначаных 500 долараў у эквіваленце. І, на думку прэм'ер-міністра, да канца года гэта зрабіць цалкам рэальна.

Што датычыцца наступнай пяцігодкі, то праект асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011-2015 гады, прапанаваны Урадам, прадугледжвае рост даходаў насельніцтва ў 2015 годзе да ўзроўню 170-176 працэнтаў да 2010 года.

Адна з умоў устойлівага эканамічнага росту — станоўчае сальда знешнегандлёвага балансу. Каб звесці баланс ужо ў наступным годзе, спатрэбяцца мільярды долараў. Дзе іх узяць? Урад бачыць выйсце ў прыватызацыі некаторых дзяржаўных прадпрыемстваў. Прэзідэнт у корані не згодзен: чым прадаваць самі прадпрыемствы, лепш прадаваць іх прадукцыю. Дарэчы, менавіта па гандлі апошняй у кіраўніка дзяржавы ўзнікла шмат пытанняў. Ён прывёў факты, калі іншаземцы з «жывымі» грашыма самі прыязджалі на завод і без умяшальніцтва на самым высокім узроўні не змаглі набыць прадукцыю, якой забітыя ўсе склады! Гэта, дарэчы, нагода да разбіральніцтва праваахоўных структур.

«Прадаваць дзяржуласнасць, каб заткнуць дзіркі ў бюджэце, якія Урад павінен закрываць экспартам, я не маю намеру! — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Палітыка ў галіне прыватызацыі застанецца той жа, што была дагэтуль».

Паводле слоў Прэзідэнта, ахвотных купіць прыбытковыя дзяржпрадпрыемствы хапае. Аднак размова будзе весціся толькі з тымі, хто прапануе сапраўдную цану і выканае шэраг вядомых патрабаванняў. Калі БелАЗ ацэнены ў 2 млрд долараў, то за 700 млн яго ніхто не аддасць. Як і «Белкалій» за 7 млрд.

«Таму той, хто сёння разлічвае на тое, што я пагаджуся на абвальны продаж дзяржуласнасці, расчаруецца. Гэта бесперспектыўна!» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён параіў членам Урада закасваць рукавы і пачынаць працаваць: ісці ўніз, на прадпрыемствы, і дабівацца рэнтабельнасці ў 20-25 працэнтаў.

Сяргей ПРОТАС.

Фота БЕЛТА.

Выхадныя ў Беларусі будуць дажджлівыя

Атлантычны цыклон з Заходняй Еўропы ў выхадныя дні пагоршыць умовы надвор'я ў Беларусі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

У нядзелю цыклон працягне свой рух на ўсход, і Беларусь апынецца ў яго халаднаватай тылавой частцы. Па-ранейшаму будзе дажджліва. У начныя гадзіны па паўночным усходзе чакаюцца моцныя дажджы. Месцамі прагрымяць навальніцы. Начная тэмпература панізіцца да 7-13 градусаў. Днём тэмпературны фон не перавысіць плюс 13-18 градусаў. Толькі на поўдні будзе амаль 20 градусаў цяпла. З ростам атмасфернага ціску ў панядзелак надвор'е крыху палепшыцца. Кароткатэрміновыя дажджы пройдуць месцамі па рэспубліцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 6-11 градусаў цяпла, а днём паветра прагрэецца да 15-22 градусаў. Паводле папярэдніх звестак, у пачатку верасня захаваецца дажджлівае надвор'е. Перыяд паляпшэння надвор'я магчымы ў другой пяцідзёнцы верасня.

Канец лета. Цвіце чаромха!

Анамальная спякота, якая стаяла ў Беларусі, адступіла. Але такое працяглае гарачае надвор'е не магло не адбіцца на прыродзе. На дварэ канец жніўня. Некаторыя дрэвы ўжо стаяць у жоўтай і карычневай лістоце — набліжаецца восень. Чаромха, якая зацвітае вясной першай, ужо стаіць амаль без лісця. І раптам... О, цуд! Маладая чаромха пакрытая... невялікімі гронкамі беласнежных кветак. Гэты цуд адбыўся ў маленькай вёсцы Авечкі Мёрскага раёна. Першым цуд убачыў мясцовы жыхар Мікалай Сямёнавіч Шамшур. Адразу і не паверыў, што такое можа адбыцца.

Відаць, такім чынам расліна адрэагавала на спякоту і адсутнасць дажджоў. Бо вядома, што ўтварэнне пладоў раслінам неабходнае для перанясення неспрыяльных умоў.

Хочацца верыць, што ў расліны пасля цвіцення яшчэ застануцца сілы для зімоўкі. І вясной яна зноў парадуе нас беласнежным цвіценнем.

В. ШАМШУР, настаўнік геаграфіі і біялогіі Папшулёўскай БШ-сада.

Рознічныя цэны на гарэлку ў Беларусі павышаны на 5 працэнтаў

З 27 жніўня павышаны адпускныя цэны на этылавы харчовы спірт і рознічныя цэны на гарэлку на 5 працэнтаў з аб'яднаннем гарэлак са спірту «Люкс» у адзіную цэнавую пазіцыю з дыферэнцыяцыяй у залежнасці ад мацунку і ёмістасці шклатары. Рознічная цана на гарэлку мацункам 40 працэнтаў складзе Br8240 за 0,5 л без кошту посуду, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.

Павышэнне ажыццёўлена ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства эканомікі ад 18 жніўня 2010 года № 126 «Аб цэнах на алкагольную прадукцыю і прызнанні страціўшымі сілу асобнага палажэння пастановы і некаторых пастаноў Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь».

Дакументам устаноўлены адзіныя ўзроўні мінімальных адпускных цэнаў на іншыя віды алкагольнай прадукцыі мацункам звыш 28 працэнтаў айчыннай вытворчасці і імпартную алкагольную прадукцыю, ніжэй за якія лікёра-гарэлачныя арганізацыі рэспублікі і імпарцёры не могуць рэалізоўваць названую алкагольную прадукцыю.

Пастанова прынята для забеспячэння эфектыўнай работы лікёра-гарэлачнай галіны, кампенсацыі павелічэння акцызнага падатку.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПУЦІН АБВІНАВАЦІЎ СПЕКУЛЯНТАЎ У ПАВЫШЭННІ ЦЭНАЎ НА ХЛЕБ

Павышэнне цэнаў на хлеб у Расіі з'яўляецца вынікам дзейнасці спекулянтаў. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, паведамляе ІТАР-ТАСС.

«Проста хтосьці нажываецца на абставінах», — заявіў прэм'ер у гутарцы з жыхарамі Хабараўскага края. Пуцін распарадзіўся, каб «рэгіянальныя антыманапольныя структуры праверылі і адсачылі прычыны росту цэнаў».

Раней Федэральная антыманапольная служба (ФАС) паведамляла, што з-за зніжэння ўраджаю збожжа ў канцы жніўня — пачатку верасня 2010 года цэны на хлеб у Расіі могуць павялічыцца на 10-15 %. Пры гэтым служба заявіла адразу некалькі спраў па падазрэнні ў завышэнні цэнаў на хлеб на рынку. Толькі ў Маскве і вобласці пад падазрэнне патрапіла каля 10 хлебазаводаў.

26 жніўня ФАС заявіла, што падазрае ўдзельнікаў аграхарчовага рынку ў змове «па некаторых таварных групах». Службоўцы адзначылі, што ў Расіі няма падстаў для росту цэнаў на асноўныя віды сацыяльна значных прадуктаў харчавання: муку, хлеб, малако і іншыя.

У жніўні глава ФАС Ігар Арцем'еў таксама казаў, што цэны на збожжа, якія ўстанаўліваюць вытворцы і прадаўцы, носяць спекулятыўны характар. Па яго словах, нарыхтаваныя запасы дазваляюць Расіі пазбегнуць росту цэнаў на збожжа.

Па звестках Расстата, цэны ў краіне растуць на 0,2 % ужо трэці тыдзень запар на фоне засухі, якая загубіла частку ўраджаю ў Расіі. За тыдзень хлеб жытні і пшанічны падаражэў на 0,9 і 0,6 % адпаведна.

У ГЕРМАНІІ КОНІ ЗАТАПТАЛІ 44 ДЗІЦЯЦІ

У Германіі коні, якія спужаліся, ледзь не затапталі да смерці 44 дзіцяці і аднаго падлетка з коннай школы. Пацярпелыя з раненнямі рознай ступені цяжкасці дастаўленыя ў бальніцу. 14-гадовая дзяўчынка, якая атрымала небяспечныя для жыцця траўмы, знаходзіцца ў рэанімацыі.

Інцыдэнт адбыўся ў ніжнесаксонскім мястэчку Латэн. Працэсія з прыкладна ста вершнікаў, пераважна дзяцей і падлеткаў, якіх суправаджалі некалькі інструктараў, выехала са стайні на вячэрнюю прагулку. У шасцярых дзяцей, якія ехалі напарадзе працэсіі, у руках былі паходні.

Па звестках паліцыі, адно дзіця выпусціла свой факел. Коні спалохаліся, пачалі скідаць з сябе наезнікаў і ўцякаць. Скінутыя дзеці апынуліся проста пад капытамі жывёл, атрымаўшы сур'ёзныя раненні.

40 % РАСІЯН ПРЫЗНАЛІСЯ Ў АДСУТНАСЦІ ПЛАНАЎ НА БУДУЧЫНЮ

Каля 40 % жыхароў Расіі не плануюць будучыню і наогул не робяць ніякіх доўгатэрміновых прагнозаў на тое, як складзецца іх жыццё. Пра гэта на сустрэчы з журналістамі заявіў генеральны дырэктар Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі (УЦВГД) Валерый Фёдараў. Яго словы прыводзіць РІА Навіны.

Кіраўнік УЦВГД мяркуе, што ў такіх вынікаў апытання расіян аб планах на будучыню могуць быць некалькі тлумачэнняў.

Па-першае, па словах Фёдарава, адсутнасць планаў можа быць вынікам «бурнага супярэчлівага часу», а па-другое, нежаданне жыхароў Расіі клапаціцца пра сваю будучыню можна назваць рысай рускага характару. Пры гэтым гендырэктар УЦВГД падкрэсліў, што колькасць расіян, якія не жадаюць планаваць будучыню, застаецца ў краіне стабільнай ужо шмат гадоў.

Так, у 1989 годзе налічвалася 42 % жыхароў, у якіх не было выразнага ўяўлення пра сваю будучыню.

Тым не менш каля 14-15 адсоткаў расіян уяўляюць сваё жыццё на пяць-шэсць гадоў наперад.

У КНДР ВЫНАЙШЛІ АНТЫРАДАРНУЮ ФАРБУ

Паўночная Карэя распрацавала камуфляжную фарбу, якая дазваляе хаваць баявую тэхніку ад радараў праціўніка. Пра гэта стала вядома з інструкцыі, якая трапіла ў рукі паўднёвакарэйскіх ваенных.

Інструкцыя была надрукавана ў Паўночнай Карэі яшчэ ў 2005 годзе. У 80-старонкавым буклеце расказваецца пра тое, як хаваць ад праціўніка не толькі тэхніку, але і збудаванні, а таксама пра тое, як імітаваць перамяшчэнне баявых адзінак, каб дэзарыентаваць ворага.

У выданні таксама цытуюцца словы Кім Чэн Іра: «Як я ўжо неаднаразова гаварыў раней, сучасныя прыёмы вядзення баявых дзеянняў заснаваныя на скрытнасці».

Паводле слоў спецыялістаў з Паўднёвай Карэі, яны былі здзіўленыя тым, што армія КНДР так далёка прасунулася ў сваіх даследаваннях. Аднак атрыманая інфармацыя, як запэўніваюць у Сеуле, «дапаможа падрыхтавацца да сутыкнення з Поўначчу».

Паўночная Карэя з'яўляецца адной з самых мілітарызаваных краін у свеце. У 2006 і 2009 гадах у КНДР адбыліся ядзерныя выпрабаванні. У красавіку 2010 года паўднёвакарэйская прэса пісала пра тое, што Паўночная Карэя збіраецца правесці выпрабаванні ў трэці раз.

Блізкая ўлада

«СТРАУСІНЫМІ» МЕТАДАМІ ПРАБЛЕМЫ НЕ ВЫРАШАЮЦЦА,

перакананы памочнік Прэзідэнта Беларусі — галоўны інспектар па Мінскай вобласці Мікалай Міхайлавіч ІВАНЧАНКА, які больш за тры гадзіны адказваў на пытанні жыхароў Нясвіжскага раёна. За гэты час па тэлефоне да яго звярнулася больш за 20 чалавек. У зваротах закраналіся тэмы рамонту жылых дамоў, добраўпарадкавання тэрыторый і іншыя. Многія з тых, хто датэлефанаваўся, скардзіліся, што мясцовыя чыноўнікі кормяць іх абяцанкамі-цацанкамі, і тут жа пра іх забываюцца. Практычна па ўсіх праблемных пытаннях Мікалай Міхайлавіч даручыў мясцовым чыноўнікам у кароткія тэрміны прыняць меры. Асобныя ж з яго лёгкай рукі вырашыліся ў той жа дзень!

Алегу СКРЫБУ (на фота ён на сваім зямельным участку разам са сваім галоўным памочнікам — сынам Ігарам) у прысутнасці журналістаў паабяцалі не забіраць зямлю-карміцельку.

«Добра, што не паспела здарыцца бяда»

Больш за ўсё ўразіў званок пенсіянера з Нясвіжа. Зарыхта Аляксей Аляксеевіч, у адрозненне ад пераважнай большасці заяўнікаў, прасіў не за сябе.

— Мікалай Міхайлавіч, здавалася б, яфрэйтарскае пытанне, але вымушаны звярнуцца да вас. Насыпраць нашых дамоў (я жыву на вуліцы Мележа) знаходзіцца кальцавая дарога. Там на ўзбочыне вось ужо месяц не могуць закрыць каналізацыйны калодзеж. Асабіста я ўжо не раз даставаў адтуль сабак. А туды ж — ніхто ж не застрахаваны — могуць зваліцца і дзеці, і дарослыя...

З просьбай закрыць калодзеж неабыякавы спадар Зарыхта звяртаўся да дырэктара жыллёва-камунальнай гаспадаркі горада. У адказ пачуў, «гэта не нашы сеткі, яны належаць заводу медыцынскіх прэпаратаў». На заводзе ж сцвярджаюць, што сеткі яны ўжо перадалі ЖКГ.

— Тэлефанаваў я і ў рэдакцыю нашай раённай газеты. Журналісты прыехалі, сфатаграфавалі. Але і пасля гэтага калодзеж як стаяў без века, так і цяпер стаіць. Я прыцягнуў дошкі і неяк закрыў яго, але ж на носе зіма, і пад снегам іх ніхто не ўбачыць. Людзі добрыя, гэты ж калодзеж знаходзіцца не дзе-небудзь на небе, а на нашай роднай нясвіжскай зямлі, якая розніца, каму ён належыць — ЖКГ ці заводу, прыехалі б разам і зрабілі. Гэта ж наша бяспека!

— Зараз жа гэты калодзеж закрыюць, — паабяцаў заяўніку памочнік Прэзідэнта і тут жа даў адпаведнае распараджэнне мясцовым чыноўнікам. — Як вы маглі такое дапусціць? Вы павінны былі ноччу ў аварыйным парадку закрыць гэты калодзеж. Добра яшчэ, што не паспела здарыцца бяда. А ўявіце сабе, каб туды ўпала дзіця? Нехта б ужо ў турме сядзеў.

Пасля званка Аляксея Аляксеевіча журналісты ногі ў рукі і памчалі на вуліцу Мележа, дзе на свае вочы ўбачылі той самы небяспечны калодзеж. Калі ж вярнуліся ў Нясвіжскі райвыканкам, дзе праходзіла «прамая лінія», пачулі радасны голас заяўніка.

— Мікалай Міхайлавіч, гэта зноў Аляксей Зарыхта. Заданне выканана. Адразу ж пасля журналістаў прыехалі спецыялісты і закрылі люк. Вельмі ўдзячныя вам і вашаму апаратыўнаму штабу. На зваротным шляху заязджайце ў госці, я вас мёдам пачастую.

СТАР. 2

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» ИНФОРМИРУЕТ:

в извещении о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимости ОАО «Зеленоборское», расположенных в п. Зеленый Бор Смолевичского района, опубликованное в газете «Звязда» от 14.08.2010 вносятся следующие изменения и дополнения:

Начальная цена с НДС Лота № 1 – 51 261 108 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4047 га.; Начальная цена с НДС Лота № 2 – 61 938 733 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1632 га.

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже здания диспетчерской ОАО «ТБЗ Усяж», опубликованное в газете «Звязда» от 24.08.2010, вносится дополнение:

площадь земельного участка – 0,1000 га.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «ТОРГОВЫЙ КОМПЛЕКС «АЭРОДРОМНЫЙ»

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-25519 (назначение — здание специализированное иного назначения, наименование — павильон по продаже продовольственных товаров) общей площадью 7 691 кв. м, 2004 года постройки, стоимостью — 32 833 270 620 (тридцать два миллиарда восемьсот тридцать три миллиона двести семьдесят тысяч шестьсот двадцать) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 38, к. 3. Стоимость указана с учетом НДС.

Торги состоятся 21.09.2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: http://minsk.court.by/

судебный исполнитель Тарашкевич А.С., тел./факс 294 93 56, 8 029 177 32 52

ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стоимости имущества в размере 1 641 663 531 белорусский рубль.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.08.2010 г. (для б/н разлікаў)		*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*	
▼ 1 долар ЗША 3 010,00	1 чэшская крона 154,63	USD 30,6969	Агенцтва Уладзіміра Грэўцова
▼ 1 еўра 3 832,03	1 польскі злоты 961,49	10 UAH 38,9061	
1 латвійскі лат 5 404,92	▲ 1 расійскі рубель 98,06	1000 BYR 10,1882	
1 літоўскі літ 1 109,08	1 украінская грыўня 381,51	EUR 39,0311	

ІП У БЕЛАРУСІ ДАЗВОЛЯЦЬ БРАЦЬ НА РАБОТУ НАЁМНЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ

У Беларусі індывідуальным прадпрымальнікам дазволяць браць на работу наёмных супрацоўнікаў. Такая магчымасць у іх з'явіцца пасля прыняцця Дырэктывы № 4 Прэзідэнта Беларусі (каардынуючым органам па распрацоўцы яе праекта з'яўляецца Мінэканомікі), накіраванай на далейшую лібералізацыю эканомікі. Аб гэтым заявіў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур на канферэнцыі Бізнэс-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя М.С. Куняўскага, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«У распрацоўваемай дырэктыве будзе змяшчацца шэраг, на наш погляд, рэвалюцыйных момантаў», -- адзначыў Андрэй Тур.

Як паведаміў намеснік міністра, у дакументе будуць уведзены нормы, звязаныя з амнісіраваннем капіталаў, свабодным рэгуляваннем рынку працы і ўстанаўленнем заработнай платы. Акрамя таго, суб'ектам гаспадарання з колькасцю супрацоўнікаў да 100 чалавек будзе прадастаўлена магчымасць пераходу на спрошчаную сістэму падаткаабкладання. На сённяшні дзень такая форма падатковай справаздачнасці прымяняецца для прадпрыемстваў з колькасцю да 15 супрацоўнікаў.

Акрамя таго, плануемым да падпісання дакументам будзе ўведзены мараторый на праверку дзейнасці прадпрыемства ў першыя 5 гадоў яго работы, а ў індывідуальных прадпрымальнікаў з'явіцца магчымасць прымаць на работу наёмных супрацоўнікаў.

Уздзенскі раён назвалі самым дрэнным у Мінскай вобласці

Пра гэта журналістам пасля комплекснай праверкі раёна заявіў Уладзіслаў Цыдзік, старшыня КДК па Мінскай вобласці.

— З 22 рэгіёнаў, якія ёсць у Мінскай вобласці, па ступені развіцця прамысловасці і эканомікі, я лічу, горш няма за Уздзенскі раён. На мой погляд, праяўлена поўная абыякавасць папярэдняга кіраўніцтва па стварэнні новых прадпрыемстваў на Уздзеншчыне, — кажа Вячаслаў Цыдзік. — Вы ведаеце, што са снежня мінулага года працуе новы кіраўнік раёна. Вядома, бачны перспектыўны кірунак, але бачна і шмат праблем.

Старшыня КДК адзначыў, што ў раёне малая колькасць прамысловых прадпрыемстваў. І кіраўніцтва раёна не заклала ў праграму развіццё інвестыцыйных праектаў.

Нягледзячы на тое, што 77 працэнтаў ВУП Уздзенскага раёна складае сельская гаспадарка, яе рэнтабельнасць, па словах спадара Цыдзіка, застаецца невысокай. Ураджайнасць збожжавых культур па раёне склала 25,7 ц/га, а ў чатырох гаспадарках менш за 20 ц/га, два СВК атрымалі нават меней за 15 ц/га.

— Такая ўраджайнасць атрымліваецца, калі проста кінуць зерне ў зямлю і нічога з ім не рабіць, — кажа Вячаслаў Цыдзік. — А там жа ёсць аграномы з вышэйшай адукацыяй...

Дрэнна развіваецца ў раёне і малы бізнэс. Па звестках на першага жніўня тут зарэгістравана 443 юрыдычныя асобы, з якіх 171 малы прадпрымальнік. Пры гэтым 38 з іх не працуюць увогуле, а лічацца толькі на паперы.

Аналагічныя праблемы і з турызмам. Да гэтага часу ў горадзе няма раённага цэнтра культуры, не рэканструявалі станцыю абезжалезвання вады і ачышчальныя забудовы, так і стаіць старая гасцініца і лазня.

Пры гэтым 60 працэнтаў бюджэту раёна складаюць датацыі з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Фактычна гэта грошы падаткаплацельшчыкаў усёй Беларусі, якія, на думку старшыні КДК, не выкарыстоўваюцца рацыянальна.

— Я бачу выйсце з гэтай сітуацыі ў тым, што трэба кардынальна мяняць стаўленне да зямлі, — кажа Вячаслаў Цыдзік. — Трэба павышаць культуру сельскай гаспадаркі. Калі ў бліжэйшыя пяць гадоў узровень не падымецца, то раён так і застанецца датацыйным. Варта вырашыць і кадравую праблему, а таксама ісці насустрач малому бізнэсу. Яму ж трэба пастаянна дапамагаць і падстаўляць плячо. А таксама развіваць турызм і прыдарожны сэрвіс: стаянкі, кемпінгі і г. д. Фактычна Уздзеншчына — гэта прысталічны рэгіён, які павінен развівацца.

Настасся ЗАНЬКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион по продаже объекта государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества состоится 1 октября 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

На открытый аукцион выставляется:

Предмет открытого аукциона	Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей с инвентарным номером 500/С - 35141 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Притыцкого, 62 А
Начальная цена предмета открытого аукциона, рублей	318 210 364 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 242 588 328 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 75 622 036 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	31 821 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Продавец недвижимого имущества	РУП «Белорусский протезно-ортопедический восстановительный центр» 220073, г. Минск, ул. Одоевского, 10, тел. (8017) 251 11 21, 205 02 22
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества и срок его аренды	Общая площадь – 0,2330 га кадастровый номер земельного участка – 500000000006001614 срок аренды – 5 лет
Арендодатель земельного участка	Минский городской исполнительный комитет
Характеристика недвижимого имущества	Двухэтажное здание, стены кирпичные. Общая площадь – 396,2 кв.м, год постройки – 1990
Условия использования недвижимого имущества	Сохранение назначения и профиля объекта сроком на 10 лет, в том числе сервисное обслуживание автотранспорта для инвалидов
Условия использования земельного участка	В соответствии с утвержденной градостроительной документацией

Порядок проведения открытого аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

К участию в открытом аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в открытом аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в открытом аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 29 сентября 2010 года включительно.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер, порядок и сроки возмещения затрат доводятся до сведения участников до начала проведения аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом.

«СТРАУСІНЫМІ» МЕТАДАМІ ПРАБЛЕМЫ НЕ ВЫРАШАЮЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Не ведаю, што буду рабіць, калі ў мяне забяруць зямлю»

Падчас «гарачай лініі» давялося патрапіць дэсанту журналістаў і на поле, усыпанае бульбай памерам з кулак. Па тэлефоне Алег Васільевіч Скрыба з вёскі Сноў не схлусіў, «другі хлеб» у яго сёлета сапраўды ўрадзіў на славу.

— Зямля тут добрая, самі бачыце, — кажа Алег Васільевіч. — Але мне яшчэ вясной у сельвыканкаме сказалі, каб я восенню вызваліў свой участак. Узамен прапанавалі зямлю за чыгункай — яна знаходзіцца ажно за чатыры кіламетры ад майго дому. Уявіце сабе, як я буду туды вазіць гной — а за сезон, як правіла, важу па 30 вазоў на сваёй кабыле Машы — гэта цэлы дзень толькі на пераезды страціш. А ў мяне ж гаспадарка немаленькая: карова і 30 авечак, 20 з іх породзістых. Не ведаю, што буду рабіць, калі ў мяне забяруць зямлю. Акрамя таго, хацелася б прадаваць воўну, але пакуль што з гэтым праблема, таму даводзіцца выкідваць. Малако таксама хацелася б здаваць дзяржаве, але наша гаспадарка «Сноў» адмаўляецца ад нашага малака, а малакавозу, які раней збіраў малако для малаказавода, нявыгадна стала прыязджаць па малако, бо ў «Снове» толькі пяць чалавек трымае кароў. Зараз па тэлебачанні толькі і чуеш, што трэба ствараць умовы для развіцця падсобных гаспадарак, а я ніякай падтрымкі не адчуваю, застаецца спадзявацца толькі на сябе.

Пры нашай размове прысутнічала **кіраўнік справамі Сноўскага сельскага выканаўчага камітэта Яўгенія РАДАМАН**, да якой мы тут жа і звярнуліся па каментар.

— Сапраўды, вясной разглядалася магчымасць замены гэтага прыватнага ўчастка на іншы, бо гэта аблегчыла б апрацоўку калгасных земляў, якія знаходзяцца вакол. Але, улічваючы ўсе нюансы, мы параіліся і вырашылі пакінуць Алегу Скрыбу яго зямлю. Няхай не перажывае і працуе спакойна. Што тычыцца збору малака, то мы не прымаем малако ад людзей, бо

Асобныя праблемныя пытанні з лёгкай рукі памочніка Прэзідэнта Беларусі вырашыліся ў той жа дзень!

яно, як не круці, не параўнаецца з якасцю «сноўскага», якое вырабляецца без судакранання з рукой чалавека. Я не адмаўляю, што ёсць у гаспадарцы праблема развіцця асабістых падсобных гаспадарак. З гэтай нагоды мы збяромся ў райвыканкаме на наступным тыдні, запросім зацікаўленых мясцовых жыхароў і абмяркуем гэтае пытанне. Я лічу, што калі хоць адзін чалавек прагне працаваць на зямлі, гадаваць скаціну, то мы проста абавязаныя стварыць для яго ўсе ўмовы.

Сваё бачанне рашэння «малочнай» праблемы на мясцовым узроўні падчас «прамой лініі» выказаў і памочнік Прэзідэнта.

— Праблема выкарыстання малака з асабістых падвор'яў, актуальная для Нясвіжскага раёна, ужо вырашана на Захадзе. Там прыватнікам даецца магчымасць рэалізоўваць свой прадукт на рынку разам з высокаканкурэнтнымі гаспадаркамі. Чаму б і вам не знайсці на нясвіжскай зямлі чалавека, які б збіраў у людзей малако, рабіў тварог, масла, сыры, ёгурты і пад сваім брэндам прадаваў іх на тым жа Камароўскім рынку? Але гэты працэс трэба арганізаваць, сабраць прадпрымальнікаў, паставіць перад імі задачу, дапамагчы ім, чым трэба. Гэта б, перакананы, стымулявала людзей трымаць гаспадарку.

«Выкідваць смецце забаронена, вядзецца відэаназіранне»

Як ужо адзначалася ў пачатку, большасць зваротаў, якія паступілі ад жыхароў турыстычнага раёна, тычыліся жыллёва-камунальнай сферы. Вось некаторыя з іх.

— Мяне завуць **Леаніда Мікалаеўна**, я жыхарка Нясвіжа. Больш за два гады ў мяне не працуе дамафон. Жыву на пятым паверсе, таму, калі да мяне прыходзяць людзі, даводзіцца, каб іх запусціць, спускацца і падымацца па лесвіцы. А мне ж ужо 62 гады, няўжо я за сваё жыццё не зарабіла сабе на дамафон? Неаднаразова звярталася ў ЖКГ. У адказ жа толькі і чую «шукайце майстар-ключ». Дзе я магу яго знайсці, калі фірмы, якая ставіла нам тыя дамафоны, ужо не існуе? Зрабіце што-небудзь.

— А дамафон толькі ў вас не працуе? — удакладніў памочнік Прэзідэнта.

— Яшчэ ў некалькіх людзей не працуе. Усе звярталіся.

— Я дам даручэнне, каб усё прывялі ў парадак.

Пасля таго, як заяўніца павесіла трубку, Мікалай Міхайлавіч, як і абяцаў, даручыў мясцовым чыноўнікам задаволіць нарэшце заяву жыхароў гэтага дома.

— Самі шукайце майстар-ключ, — адзначыў Мікалай Іванчанка. — Не трэба дзейнічаць «страусінымі» метадамі, перакладаючы свае праблемы на іншых людзей. Калі трэба, дэмантыруйце старую сістэму і перавядзіце на новую. Даю вам месяц, аб прынятым рашэнні абавязкова мне паведаміце.

«Тэлефануе вам **Леанід Леанідавіч** з Нясвіжа. Жыву на выездзе з Нясвіжа ў старым непрыглядным доме. Каля нашага дома праязджае шмат турыстаў. Мала таго, што дом страшны звонку, дык і вада яшчэ паступае ў пад'езд. І гэта пасля таго, як у нас зрабілі касметычны рамонт».

З жахам чакаюць сезону дождж **Людміла Іванаўна з вуліцы Усходняй і Станіслаў Сцяпанавіч з вуліцы Ціміразева**. Жыхары раённага цэнтра скардзіліся на тое, што на вуліцах, дзе яны жывуць, вось ужо больш як па 30 гадоў не кладуць асфальт. Толькі абяцаюць год за годам. «Калі пытаемся, дзе асфальт, кажуць, што няма сродкаў. У той жа час «маладыя» вуліцы, дзе жывуць начальнікі, праедзьце паглядзіце, заасфальтаваныя. Як гэта можна зразумець?»

Пад канец размовы Людміла Іванаўна расплакалася і паскардзілася на работу ўрачоў.

— Калі ў нас урачы ў Нясвіжскай бальніцы пачнуць лячыць людзей? Муж пайшоў да хірурга з анкалогіяй, дык ён яму сказаў, пагрэць трэба. Мы грэлі. А калі прыехалі ў Мінск, урачы за галаву схапіліся: «хто ж вам сказаў грэць?» Не раз чула, урачам мала плацяць, вось яны так і лечаць. Раней такога не было. У мяне астэахандроз, жудасны боль. «Зрабіце што-небудзь», — прашу. Мне ж у адказ: «гэта вы солей за ўсё жыццё шмат накапілі, нічога страшнага, з імі жыць будзеце». Як так можна?

Карэспандэнт «Звязды» на свае вочы пабачыла той самы небяспечны калодзеж, пра які паведаміў па «гарачым тэлефоне» Аляксей Зарыхта. Адразу ж пасля журналістаў прыехалі спецыялісты і закрылі яго.

Валянціна Яўгеньеўна з вёскі Заазер'е скардзілася на тое, што ў цэнтры аграгарадка несвоечасова вывозіцца смецце, а таксама засмечаны двор сталовай, якая знаходзіцца побач з крамай «Дружба», да таго ж яшчэ і зарос бур'янам.

Падобную тэму закрануў і **Аляксандр Ігаравіч з Нясвіжа**.

— У нас побач з домам парк XVIII стагоддзя. Пастаянна ходзім з жонкай і дзецьмі і збіраем там смецце. Трэба неяк прывіваць культуру паводзінаў гараджанам. Я ўжо думаў, што там нядрэнна было б паставіць шыльдачку з надпісам накшталт «Выкідваць смецце забаронена, вядзецца відэаназіранне».

— Цудоўная прапанова. Я думаю, вашы мясцовыя камунальныя службы возьмуць яе на ўзбраенне.

Напрыканцы «прамой лініі» Мікалай ІВАНЧАНКА паабяцаў дадаткова прааналізаваць усе праблемныя пытанні, паднятыя жыхарамі раёна. Сказаў, што абавязкова заедзе ў Заазер'е, каб на ўласныя вочы пабачыць засмечаны аграгарадок, праедзе па прыватным сектары Нясвіжа, каб паглядзець стан дарог. Акрамя таго, памочнік Прэзідэнта акрэсліў праблему, якая, паводле яго слоў, актуальная не толькі для Нясвіжчыны, але і для ўсёй рэспублікі. Гэта праблема недафінансавання капітальнага рамонту дамоў. Паводле яго слоў, каб вырашыць гэту праблему, трэба аб'яднаць намаганні Урада, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, абласных і райвыканкамаў. Трэба выпрацоўваць новыя падыходы, задумацца аб выкарыстанні кардынальна новых тэхналогій правядзення капітальнага рамонту.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

Абзац

◢ Паводле аператыўных звестак, колькасць насельніцтва Беларусі на 1 жніўня гэтага года (з улікам папярэдніх вынікаў перапісу 2009 года), склала 9 млн. 467,7 тыс. чалавек. У параўнанні з 1 студзеня бягучага года жыхароў краіны стала менш на 12,5 тыс. чалавек.

◢ **У студзені—ліпені гэтага года зарэгістравана звыш 39,6 тыс. шлюбаў. За сем месяцаў 2010 года на 1000 жыхароў рэспублікі прыпадала 7,2 шлюбаў. У студзені—ліпені гэтага года скасавана амаль 19,8 тыс. шлюбаў. На 1000 жыхароў рэспублікі прыпадае 3,6 разводаў. За гэты перыяд на 1000 шлюбаў прыпадала 499 разводаў.**

◢ Узнагароджанне ганаровым нагрудным знакам «Ганаровы эколаг Рэспублікі Беларусь» упершыню адбудзецца ў час VIII Рэспубліканскага экалагічнага форуму ў Гродне, які пройдзе ў горадзе над Нёманам 27-29 жніўня. Нагрудны ганаровы знак «Ганаровы эколаг Рэспублікі Беларусь» зацверджаны ў 2010 годзе. Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Цалко на адкрыцці форуму ўручыць узнагароды спецыялістам, якія ўнеслі вялікі практычны і навуковы ўклад у ахову беларускай прыроды.

◢ **Прараб адной з будаўнічых фірмаў у Мінску падазраецца ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі і выкраданні больш за Br242 млн са сродкаў ЖКГ. Фірма павінна была выконваць капітальны рамонт жылога будынка. Прараб паведамляў у ЖРЭА Савецкага раёна Мінска, што работы вядуцца, але насамрэч ніякі рамонт не ажыццяўляўся.**

◢ Амаль 40 шведскіх спецыялістаў будуць манціраваць сцэну дзіцячага «Еўрабачання-2010» у Мінску. Несумненна, шведам будуць дапамагаць беларускія спецыялісты, плануецца таксама запрасіць украінскіх прафесіяналаў. Мантаж сцэны папулярнага тэлешоу Еўропы ў «Мінск-Арэне» будзе прадаўжацца амаль два тыдні.

◢ **26 жніўня каля 18.15 паблізу вёскі Палашкова Клімавіцкага раёна «Фальксваген», якім кіравала маладая жанчына, ударыўся ў дрэва і з'ехаў у кювет. Аварыя адбылася з-за няправільнага выбару хуткасці: вадзіцель не справілася з кіраваннем. Жанчына была шпіталізаваная, а пасажыр — яе муж 1983 года нараджэння — загінуў.**

◢ Мастацкі фільм «Ваўкі» рэжысёра Аляксандра Колбышава будзе прадстаўляць Беларусь на XIV Форуме нацыянальных кінематаграфій. Ён пройдзе ў Маскве з 28 жніўня па 3 верасня. Усяго ў праграме форуму 10 поўнаметражных ігравых карцін, якія прадстаўляюць актуальны кінематограф Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Літвы, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны і Эстоніі.

◢ **У Мінску затрыманы мінчанін 1993 года нараджэння пры збыце 0,6 г марыхуаны. Падчас далейшых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў паблізу вёскі Паперня Мінскага раёна на дачным участку яго маці было знойдзена і канфіскавана 5,6 кг канапель.**

◢ У Маскве ўчора ноччу быў забіты грамадзянін Беларусі. Гэта быў прыезджы з Гродна 1960 года нараджэння, ён памёр ад шматлікіх колата-рэзаных ранаў у вобласць галавы, шыі і грудзей. Устаноўлена, што мужчына каля паўгода пражываў у Маскве без рэгістрацыі і нідзе не працаваў.

◢ **У Валожынскім раёне 26 жніўня ў 9.40 грузавік ГАЗ сутыкнуўся з трактарам МТЗ, які ехаў у спадарожным напрамку. Грузавая машына з'ехала ў кювет і перакулілася, а вадзіцель 1990 года нараджэння загінуў.**

Поўны абзац

◢ Брытанец Джэймс Гілпін распрацаваў рэцэпт прыгатавання віскі з чалавечай мачы. Па словах аўтара ідэі, для вытворчасці алкагольнага напою ён выкарыстоўвае мачу людзей, якія пакутуюць на цукровы дыябет. У верасні 2010 года Гілпін збіраецца прадставіць сваю прадукцыю на дызайнерскай выставе ў Лондане.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 сентября 2010 года ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Наименование продаваемого имущества	**Здание специализированное для образования и воспитания общей площадью 1083,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-18102 (А 2/к. Здание детского сада)**
Сведения о земельном участке	кадастровый номер 500000000002001592, площадь – 0,3834 га
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, пр-т Партизанский, д. 71Б
Балансодержатель (продавец)	ЧУП «Поречье Белкоопсоюза», пр-т Победителей, 17, 220004, г. Минск, (017) 203 82 93
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 48 36
Начальная цена с учетом НДС	3 453 732 000 белорусских рублей
Сумма задатка	300 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **29 сентября 2010 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **30.08.2010 по 23.09.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017) 226 97 08 – ЧУП «Поречье Белкоопсоюза».

Мікалай МАРТЫНАЎ, генеральны дырэктар СТАА «Марко»:

«У кожнага з нас павінна быць свая гісторыя»

Сёлетні год для многіх прадстаўнікоў айчыннага бізнэсу можна назваць пасткрызісным. Здаецца, наступіла цішыня на самых разнастайных кірунках прадпрымальніцкай дзейнасці для кіраўнікоў самага рознага маштабу. Хоць, магчыма, гэта толькі здаецца. І яшчэ далёка не кожны з іх выйшаў на шлях паспяховага вядзення прыватнай справы.

У некаторых прадстаўнікоў айчыннага бізнэсу сусветны эканамічны крызіс, здаецца, не выклікаў страху. Яны паспяхова справіліся з наступствамі і форс-мажорнымі абставінамі, што нясе ў сабе панікa альбо няўпэўненасць у сваіх сілах. І як тут не ўспомніць старую ісціну пра ролю асобы ў гісторыі, якая можа быць даволі значнай, а падчас і ключавой.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Фігура кіраўніка сумеснага беларуска-германскага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко» Мікалая Мартынава для прадпрыемства — якраз той выпадак. Вось ужо на працягу 19 гадоў ён аднаасобна ўзначальвае перадавое ў краіне абутковае прадпрыемства, штогод прыўносячы ў гэты бізнэс свежыя модныя плыні, новыя ўзоры еўрапейскага абутку, фарміруючы ў значнай меры эканоміку рэгіёна.

— Мікалай Васільевіч, сёлетні год для прадпрыемства «Марко», як і ўсёй айчыннай эканомікі, асаблівы: сусветны крызіс адступіў. Якія наступствы засталіся для прадпрыемства, якое вы ўзначальваеце?

— Не ў якасці самахвальства скажу, што мы яго паспяхова адолелі і нават не адчулі, што ён быў, бо былі гатовыя да самых экстрэмальных умоў працы. Мяркую, што такая згуртаванасць станоўча паўплывала на агульную дынаміку развіцця СТАА «Марко». І сёння мы, як у тым мульціку: будавалі, будавалі і нарэшце пабудавалі.

— Гэта вы пра ўзвядзенне бізнэс-цэнтра «Марко-Сіці», які неўзабаве ўбачыць свет дзякуючы фінансавай дапамозе вашага прадпрыемства?

— Часткова гэта так. Сапраўды, ужо прайшло больш за два гады, як пад патронатам «Марко» пачалося будаўніцтва забаўляльнага цэнтра «Марко-Сіці». Першапачаткова яго завяршэнне планавалася на канец гэтага года. Праўда, па незалежных ад нас прычынах, будаўніцтва зацягнулася, і цяпер у планах разразанне стужачкі значыцца на сакавік 2011 года. Але ж, ведаючы тэмпы работ нашых будаўнікоў, магу меркаваць, што здача аб'екта перанясецца на канец будучага года.

— Калі я правільна разумею, то вы хацелі закрануць яшчэ нейкую тэму?

— Так, прычым выключна прафесійную. У канцы 2009 — пачатку 2010 года кампанія «Марко» сумесна з італьянскімі партнёрамі (вядомай абутковай фірмай «Балдзініні») узяліся рэалізаваць вельмі важны для нас праект: выпуск высакаякаснага скуранога мужчынскага і жаночага абутку пад вядомай італьянскай маркай Bravo. Гэты абутак ужо пачынае сыходзіць з канвеера прадпрыемства і ў хуткім часе будзе адпраўляцца спажыўцу.

— Не толькі беларускаму?

— Безумоўна, геаграфія паставак будзе больш шырокай. Мяркуецца, што першая партыя, якая будзе выраблена сёлета, складзе каля 100 тысяч пар. Мы ўжо паспелі прэзентаваць навінку ў Расіі і ва Украіне, збіраемся паказаць яе ў Прыбалтыцы і ў належнай меры забяспечыць беларускіх пакупнікоў.

— Лінейка абутку Bravo істотна адрозніваецца ад звычайнага скуранога асартыменту «Марко»?

— Сказаць, што яна будзе на пазіцыю вышэй за масавую прадукцыю, будзе праўдай, хоць звычайныя чаравікі ці боты «Марко»заўсёды вызначаюцца самымі лепшымі абутковымі характарыстыкамі. І тым не менш абутак «Bravo» — гэта прадукцыя прэміум-класа з адпаведнай цаной. Пры вырабе навінак выкарыстоўваюцца лепшыя скураныя матэрыялы, прымяняюцца больш модныя і запатрабаваныя аксесуары. Так што я ўпэўнены: што новы абутковы асартымент «Марко-Bravo» хутка завалюе свайго пакупніка.

— Мікалай Васільевіч, сёлетняе лета было гарачым. У сувязі з гэтым ці не плануецца ўнесці пэўныя карэктывы на сезон вясна-лета 2011 года?

— Нашы мадэльеры ўжо зрабілі «папраўкі на вецер», і на будучы год сёлетнія ўмовы надвор'я будуць улічаныя.

— Для прадпрыемства «Марко» апошнім часам былі характэрныя гіганцкія крокі ў нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці абутку. Гэта тэндэнцыя захоўваецца?

— Пакуль так. З улікам вытворчых плошчаў ААТ «Чырвоны Кастрычнік» і асваення новай моднай італьянскай лінейкі Bravo вытворчыя магутнасці выраслі ў 2010 годзе на 20-25 працэнтаў і па яго выніках складуць каля 4 мільёнаў пар абутку. Згадзіцеся, што лічба нядрэнная.

— Нарошчванне аб'ёмаў мае на ўвазе і асваенне новых рынкаў збыту?

(организатор аукциона) по поручению РУП «БМЗ» (продавец)

извещает о проведении 30 сентября 2010 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18

№ лота	Наименование оборудования	Начальная цена продажи, без НДС, руб. РБ	Задаток, без НДС, руб. РБ
1	Станок деревообрабатывающий С25-4УХЛ, инв. № 013964	3 196 984	300 000
2	Бетоносмеситель, инв. № 004953	65 000	6 000
3	Отрезной круглопильный станок 8Г663.100, инв. № 007744	5 070 614	500 000
4	Пресс МГП-2, инв. № 022096	1 928 784	190 000
5	Станок токарно-винторезный 16Д25, инв. № 012867	3 559 869	350 000
6	Сварочный аппарат «Гелиос», инв. № 013060	115 654	10 000
7	Автоклав АВТН-1200-1-500-12,5, инв. № 019790	20 697 000	2 000 000
8	Сварочный аппарат ВД-0801, инв. № 020342	115 000	10 000
9	Сварочный аппарат ВД-0801, инв. № 020360	115 000	10 000
10	Бетономешалка Б-100л, инв. № 020788	455 000	45 000
11	Дробилка щековая СМД-508, инв. № 038178	3 008 445	300 000

Продавец: Республиканское унитарное предприятие «Белорусский металлургический завод», контактный телефон: 8 02334 5 42 24.

Имущество расположено по адресу: ул. Промышленная, 37, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. **Шаг аукциона – 5 %.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 27 сентября 2010 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (лоты №№ 1–11) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет организатора аукциона: № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763 УНП 400071204.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 89 64, 74 17 34.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- **Оценка оборудования и транспортных средств**
- **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**
- **Независимая строительная экспертиза**

Извещает о проведении аукциона по продаже имущества 14 сентября 2010 года

№ лота	Наименование объекта	Адрес объектов продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Универсальное энергетическое средство УЭС 2-250, г/н ЕА 5829	Калинковичский район, д. Казанск	93 270 517	4 663 500
2	Прицеп 2ПП4 без номера		866 683	43 300
3	Автомобиль ГАЗ-53 бензовоз, г/н АВ 2948-3		3 553 883	177 700
4	Автомобиль ЗИЛ ММЗ-554, г/н АВ 1564-3		7 857 713	392 900
5	Сеялка овощная СО-4,2		3 449 424	172 500
6	Охладитель ЦН-125		83 974	4 200
7	Протравливатель		1 916 767	95 800
8	Охладительная установка СА-1600		100 391	5 000
9	Плуг ПЛН 3-35		908 688	45 400
10	Культиватор		1 236 518	61 800
11	Сосуд Дюара		442 567	22 100
12	Разбрасыватель ПРТ-7		3 870 470	193 500
13	Петкус		1 950 599	97 500
14	Весы молочные		281 686	14 000
15	Ксерокс		53 246	3000
16	Двигатель асинхронный марки 3Ф № 1		138 292	7000
17	Двигатель асинхронный 3Ф № 2		138 292	7000
18	Цистерна		3 218 915	160 900
19	Вагон-бытовка		847 234	42 400
20	Емкость металлическая 20 м³		1 941 427	97 100
21	Емкость металлическая 75 м³		13 258 306	662 900
22	Электродвигатель 90кВт		2 447 590	122 400

Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве ФК «Савицкий В.В.»

Срок подачи заявления	**До 17.00 13 сентября 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**14 сентября 2010 г.** в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 10 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота плюс публикация информационного сообщения.
Условие пользования	Объекты продаются в собственность.

Более подробная информация об условиях участия в аукционе и перечне документов для участия опубликована в газете «Звязда» № 124 от 29.06.2010 г.

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

Открытое акционерное общество «Чернавчицкий завод ЖБИ»

приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ», в количестве до 8315 штук по цене 45040 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшего аннулирования и уменьшения уставного фонда Общества. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, — с 30.08.2010 г. по 01.09.2010 года. Предложения предоставляются по адресу: 225030, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г, Брестский район.

Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 02.09.2010 г. по 26.09.2010 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: 225030, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г, Брестский район.

Сроки, форма и порядок оплаты — наличными денежными средствами или перечислением денежных средств на счет продавца не позднее 30 (Тридцати) банковских дней с момента заключения сделки.

Конт. тел. 8 0162 94 57 66. УНП 200034706

У **суд г. Жодзіна** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Сакаловай Святланы Уладзіміраўны**, 1982 года нараджэння, ураджэнкі г. Жодзіна, апошняе вядомае месца жыхарства — Мінская вобл., г. Жодзіна, вул. Ракасоўскага, д. 8, кв. 63.

Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Сакалову Святлану Уладзіміраўну, паведаміць іх суду г. Жодзіна (вул. Брэсцкая, д. 5 А, каб. № 5).

НЕБЯСПЕЧНЫЯ СЛЯДЫ «ВЯЛІКАЙ ХІМІІ»

На думку спецыялістаў, адной з галоўных пагроз чалавецтву застаюцца стойкія арганічныя забруджвальнікі

Рэзкае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і агульнае павышэнне ўзроўню жыцця — аспрэчваць станоўчыя вынікі прамысловага і сельскагаспадарчага прарыву мінулага стагоддзя нібыта не выпадае. Аднак адваротны бок ёсць не толькі ў месяца і бутэрброда. Бо не сакрэт: інтэнсіўнае развіццё гаспадаркі абвастрыла праблему шкодных для прыроды і чалавека хімічных рэчываў. Прычым асаблівае месца сярод іх займаюць так званыя стойкія арганічныя забруджвальнікі — на думку навукоўцаў, яны ўяўляюць не меншую небяспеку, чым парніковыя газы і сумнавядомае глабальнае пацяпленне.

«Брудны тузін». І не толькі

Хімічныя спалучэнні і сумесі атрымалі шырокае выкарыстанне яшчэ з 1920-30 гадоў, прычым з даволі высакароднай мэтай — мець больш танную і больш разнастайную прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю. Пра небяспеку загаварылі значна пазней — у часы в'етнамскай вайны. А ў 1970-х даследаванні толькі пацвердзілі, што шэраг арганічных спалучэнняў мае надзвычай высокую таксічнасць, можа заставацца ў навакольным асяроддзі вельмі працяглы час і да таго ж назапашвацца ў тлушчавых тканках жывёл і чалавека. Прычым з-за здольнасці перасоўвацца на значныя адлегласці з паветрам, вадой і жывымі арганізмамі стойкія арганічныя забруджвальнікі (САЗ) патрапілі ці не ва ўсе куткі планеты. І, такім чынам, пра іх загаварылі як пра сапраўды сусветную праблему.

Прыгэтым усведамленне пагрозы прынесла канкрэтны вынік. У маі 2001 года ў шведскім Стакгольме прадстаўнікамі некалькіх краін была падпісана спецыяльная Канвенцыя аб стойкіх арганічных забруджвальніках, якая пачала дзейнічаць з 17 мая 2004 года. Стакгольмская канвенцыя паклала пачатак сусветнай забароне на вытворчасць, гандаль, выкарыстанне і захоўванне найбольш небяспечных стойкіх арганічных забруджвальнікаў і адначасова вызначыла пералік самых шкодных хімічных рэчываў. Першапачаткова ў гэтым спісе аказалася 12 пазіцый, прычым яны дзеляцца на тры групы.

У прыватнасці, у першую групу патрапілі **9 хлорарганічных пестыцыдаў** — таксафен, альдрын, дыэльдрын, эндрын, мірэкс, ДДТ (дуст), хлордан, гептахлор, гексахлорбензол. Варта заўважыць, што вытворчасць і выкарыстанне большасці гэтых рэчываў ўжо даўно забароненая, аднак у сувязі з шырокім распаўсюджваннем у сельскай гаспадарцы пестыцыдаў у мінулым, ва ўсім свеце засталіся іх значныя нявыкарыстаныя запасы і забруджаныя імі ж глебы. Прычым гэта праблема датычыцца і Беларусі. Апроч таго, застаецца дагэтуль актуальнай тэма таго ж дусту — з яго дапамогай і па сёння шэраг краін Афрыкі, Азіі, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі спрабуюць змагацца з пераносчыкамі такіх захворванняў, як малярыя ці клешчавы энцэфаліт.

Стойкія арганічныя забруджвальнікі могуць быць прычынай захворванняў скуры, парушэнняў функцыянавання імуннай, рэпрадукцыйнай, гарманальнай і нервовай сістэм, спрыяць развіццю дыябету, выклікаць змяншэнне перыяду лактацыі ў кормячых маці і адставанне ў разумовым развіцці дзяцей.

У другую групу стойкіх арганічных забруджвальнікаў увайшлі **поліхларыраваныя біфенілы — ПХБ**. З улікам устойлівасці ў прыродзе, высокай таксічнасці і здольнасці да назапашвання ў арганізме іх вытворчасць таксама была забаронена спецыяльным рашэннем ААН, і тым не менш, факт застаецца фактам: ПХБ дагэтуль прысутнічаюць у тэхнічных прыстасаваннях, галоўным чынам у трансфарматарах і кандэнсатарах, іншых матэрыялах і абсталяванні. Нарэшце, трэцюю групу складаюць **дыяксіны і фураны**. У «чыстым» выглядзе гэтыя хімічныя рэчывы нікім не вырабляюцца. Аднак яны ўтвараюцца падчас многіх вытворчых працэсаў з удзелам хлору — напрыклад, у цэлюлозна-папяровай, металургічнай і хімічнай прамысловасці. І, да слова, дыяксіны і фураны не без падстаў лічацца «суперэкатаксікантамі» — па моцы свайго ўздзеяння яны пераўзыходзяць такія яды, як стрыхнін і курарэ.

Між тым першапачатковы спіс з 12 найбольш шкодных хімічных рэчываў ужо павялічыўся. Так, на чацвёртай нарадзе Канферэнцыі Бакоў Стакгольмскай канвенцыі да іх былі аднесены з выключэннямі хлордэкон, гексабромдыфеніл, пентахлорбензол, лідан, альфа-гексахлорцыклагексан, бета-гексахлорцыклагексан, тэтрабромдыфенілавы эфір і пентабромдыфенілавы эфір (камерцыйны пентабромдыфенілавы эфір), гексахлордыфенілавы эфір і гептабромдыфенілавы эфір (камерцыйны актабромдыфенілавы эфір), перфтарактанавая сульфонавая кіслата, яе солі і перфтарактанавыя сульфанілфтарыды. Прычым было вырашана ўключыць хлордэкон, гексабромдыфеніл, альфа-гексахлорцыклагексан, бета-гексахлорцыклагексан у забаронены пералік А, а пентахлорбензол — у пералік С. У тым жа пераліку А апынуўся і лідан, праўда, з агаворкай — працягваць яго выкарыстанне дазволена ў фармацэўтычных мэтах. Нарэшце, у пералікі Канвенцыі таксама ўвайшлі пентабромдыфенілавы эфір і актабромдыфенілавы эфір — з дазволам перапрацоўкі і экспарту тавараў, якія ўтрымліваюць гэтыя рэчывы, да 2030 года.

Паколькі стойкія арганічныя забруджвальнікі назапашваюцца ў тканках, якія ўтрымліваюць у вялікай колькасці тлушчы, вельмі пажадана абмежаваць спажыванне тлустых прадуктаў, таго ж сала, тлустага мяса і рыбы. Апроч таго, медыкі не раяць піць ваду з адкрытых вадаёмаў, паліць плёнку і пластыкавыя бутэлькі, а таксама рэкамендуюць вельмі пільна ставіцца да прапановы набыць «з рук» сродкі абароны раслін ці сродкі абароны ад насякомых.

Плюс недзіцячыя праблемы немаўлят...

Рэальную пагрозу чалавеку ўяўляюць нават малыя дозы стойкіх арганічных забруджвальнікаў — з-за генатаксічнага, імунатаксічнага і канцэрагеннага эфектаў. Да таго ж з цягам часу выніковая канцэнтрацыя САЗ у тканках чалавека і жывёл не змяншаецца, а наадварот, узрастае. Стойкія арганічныя забруджвальнікі валодаюць здольнасцю захоўвацца ў навакольным асяроддзі дзесяцігоддзямі. І дзесяцігоддзямі трапляць у арганізм чалавека з мясам, рыбай, яйкамі і малочнымі прадуктамі, а пры знаходжанні блізу крыніц САЗ — і з паветрам. Даследаванні сведчаць, што стойкія арганічныя забруджвальнікі могуць быць прычынай захворванняў скуры, парушэнняў функцыянавання імуннай, рэпрадукцыйнай, гарманальнай і нервовай сістэм, спрыяць развіццю дыябету, выклікаць змяншэнне перыяду лактацыі ў кормячых маці і адставанне ў разумовым развіцці дзяцей.

— Пакуль няма канчатковага пацвярджання, што тыя ж дыяксіны становяцца прычынай анкалагічных захворванняў, вывучэнне гэтага пытання — справа будучыні, — распавядае намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Ірына Засценская. — Аднак навука дакладна ведае іншае: дыяксіны наносяць моцны ўдар па імуннай і эндакрыннай сістэмах, гэтыя рэчывы выклікаюць захворванні печані і хлоракнэ — практычна невылечныя вугры на твары. Апроч таго, наступствамі канцэнтрацыі дыяксінаў становяцца нейрапаводзінавыя змяненні і змяненні функцыі шчытападобнай залозы, другасная імунная недастатковасць у немаўлят, якія харчавалі-ся забруджаным малаком маці, адставанне ў фізічным і разумовым развіцці дзяцей, ганадатаксічны і мутагенны эфект — не сакрэт, што ў вайскоўцаў ЗША, якія ваявалі ў В'етнаме, затым часцяком з'яўляліся дзеці з яскарава выражанымі выродлівасцямі.

Не меншыя праблемы са здароўем выклікаюць **пестыцыды**. Нягледзячы на тое, што выкарыстанне пестыцыдаў з утрыманнем САЗ у сельскай гаспадарцы даўно забаронена, іх рэшткі і сёння застаюцца ў садавіне і агародніне. І ў тым ліку ў яблыках, грушах, моркве і апельсінах, якія звычайна становяцца асноўнай сыравінай для вытворчасці прадуктаў дзіцячага харчавання. Пры гэтым асаблівую небяспеку па-ранейшаму ўяўляе ДДТ. Пад уздзеяннем дусту могуць развівацца гарманальныя змены, паражэнні нырак, цэнтральнай і перыферычнай нервовых сістэм, цыроз печані, хранічны гепатыт, анкалагічныя захворванні — ДДТ не без падстаў адносіцца да групы высокай канцэрагеннай рызыкі.

У сваю чаргу галоўная небяспека ці не найбольш распаўсюджаных стойкіх арганічных забруджвальнікаў — поліхларыраваных біфенілаў — заключаецца ў рызыцы парокаў развіцця ў дзяцей, замаруджванні іх інтэлектуальнага развіцця, уплыве на эндакрынную сістэму, змяненні сэксуальных паводзінаў.

— Праведзеныя ў Беларусі даследаванні назапашвання хлорарганічных пестыцыдаў у арганізме чалавека не засведчылі перавышэнне дапушчальных міжнародным стандартамі доз, і ў тым ліку ў цэлым адхіленні ад нормы не былі адзначаныя сярод цяжарных жанчын і кормячых маці, — кажа Ірына Засценская. — Высветлілася, што агульная сітуацыя з уздзеяннем хлорарганічных пестыцыдаў не з'яўляецца крытычнай. Аднак назваць яе цалкам спрыяльнай таксама нельга. Даследаванні паказалі, што ва ўсіх пробах малака кормячых маці прысутнічае ДДТ у выглядзе больш устойлівага метабаліта ДДЕ, а таксама гексахлорцыклагексан. Пры гэтым у шэрагу выпадкаў іх сутачныя нагрузкі на арганізм дзіцяці перавышалі дапушчальныя ўзроўні. А адсюль напрошваецца выснова — праблема стойкіх арганічных забруджвальнікаў для нашай краіны застаецца вострай.

Што змяншае рызыку?

Бяспека — справа не ў апошнюю чаргу асабістая. І ў сувязі з гэтым медыкі раяць заўсёды прытрымлівацца некалькіх нескладаных правілаў. Паколькі стойкія арганічныя забруджвальнікі назапашваюцца ў тканках, якія ўтрымліваюць у вялікай колькасці тлушчы, вельмі пажадана абмежаваць спажыванне тлустых прадуктаў, таго ж сала, тлустага мяса і рыбы. Прычым перш-наперш гэта датычыцца цяжарных жанчын і кормячых маці.

Другая парада — ніколі не піць ваду з адкрытых вадаёмаў і не спажываць рыбу з вадаёмаў, якія знаходзяцца блізу звалак, месцаў пахаванняў пестыцыдаў, прамысловых прадпрыемстваў. Па-трэцяе, не варта захоўваць ваду і прадукты харчавання ў тары, у якой раней знаходзіліся хімічныя рэчывы — як правіла, такая тара пафарбавана ў чырвоны, жоўты ці аранжавы колер або, як варыянт, мае палоскі гэтых жа колераў. У чацвёртых, неабходна вельмі пільна ставіцца да прапановы набыць невядомыя сродкі абароны раслін ці сродкі абароны ад насякомых, асабліва калі гаворка ідзе аб продажы «з рук». Забароненыя амаль тры дзесяцігоддзі таму пестыцыды дагэтуль захоўваюцца на складах сельгаспрадпрыемстваў і ў прыватных гаспадарках — не выключана, што вам будуць прапанаваныя менавіта яны. І такі важны нюанс. Вядома, што дыяксіны і фураны ўтвараюцца пры спальванні, і ў тым ліку пры спальванні палімерных матэрыялаў. Таму паліць плёнку ці пластыкавыя бутэлькі нельга. А тым больш нельга выкарыстоўваць пад угнаенні попел, які атрымліваецца пры спальванні палімераў ці драўніны, што была апрацаваная хімічнымі рэчывамі.

Шэраг арганічных спалучэнняў мае надзвычай высокую таксічнасць, можа заставацца ў навакольным асяроддзі вельмі працяглы час і да таго ж назапашвацца ў тлушчавых тканках жывёл і чалавека. Прычым з-за здольнасці перасоўвацца на значныя адлегласці з паветрам, вадой і жывымі арганізмамі стойкія арганічныя забруджвальнікі (САЗ) патрапілі ці не ва ўсе куткі планеты.

Аднак толькі мераў асабістай перасцярогі яшчэ не дастаткова. Ці не кожнаму зразумела, што перш-наперш праблема САЗ павінна вырашацца на дзяржаўным узроўні. І ў гэтым плане робіцца сапраўды шмат — у Беларусі наладжаны строгі кантроль за забруджваннем прадуктаў харчавання і харчовай сыравіны, пітной вады, вадаёмаў і глебы.

Прычым апошнім часам патрабаванні да ўтрымання хлорарганічных пестыцыдаў, і ў першую чаргу ў прадуктах харчавання, сталі больш жорсткімі — сёння тут дзейнічаюць падыходы Еўрасаюза. А падыходы да нармавання дыяксінаў па сутнасці адпавядаюць рэкамендацыям Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. І ў гэтым выпадку асабліва ўвага надаецца прадуктам, якія патэнцыйна могуць утрымліваць САЗ, — мясу, малаку і малочным прадуктам.

— Ёсць усе падставы сцвярджаць, што па пестыцыдах і дыяксінах кантралююцца ўсе патэнцыйна небяспечныя прадукты, — падкрэслівае Ірына Засценская. — Тое ж можна казаць і ў дачыненні да поліхларыраваных біфенілаў — іх ўтрыманне адсочваецца ў айчыннай і імпартнай рыбе, рыбных кансервах. Аднак тут усё ж існуюць некаторыя праблемы, над якімі вядзецца работа. Напрыклад, ёсць дыяксінападобныя ПХБ, якія ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана пакуль не ўвайшлі ў разрад дыяксінаў. У ЕС падыход цяпер іншы — дыяксінападобныя ПХБ прыраўноўваюцца да дыяксінаў. І падобны пункт гледжання трэба прыняць і нам — таму гэта пытанне будзе выносіцца на разгляд рабочай групы па гарманізацыі санітарных патрабаванняў у рамках Мытнага саюза.

Плюс да таго заслугоўвае ўвагі тэма поліхларыраваных біфенілаў, дыяксінавы эфект якіх не даказаны. Сёння наяўнасць такіх ПХБ кантралюецца толькі па рыбе. Аднак, падкрэслівае Ірына Засценская, па-першае, кантроль неабходна распаўсюдзіць і на іншыя прадукты — у прыватнасці, з мяса і малака. А, па-другое, трэба выходзіць на адзінае нармаванне ПХБ у рамках Мытнага саюза — чакаецца, што афіцыйныя прапановы на гэты конт будуць вынесеныя на разгляд рабочай групы Саюза ўжо да канца гэтага бягучага года.

Між тым больш жорсткае стаўленне да стойкіх арганічных забруджвальнікаў зусім не выпадковае. Паводле ўказа кіраўніка дзяржавы ад 26 снежня 2006 года Беларусь далучылася да Стакгольмскай канвенцыі. Як вынік, у нашай краіне быў распрацаваны Нацыянальны план дзеянняў па выкананні абавязацельстваў аб САЗ на 2007—2010 гады і надалей — да 2028 года. Пры гэтым было вызначана, што каардынатарам дзеянняў па выкананні Нацыянальнага плана стане **Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя**.

— Першачарговымі задачамі Нацыянальнага плана вызначана ўдасканаленне нашага заканадаўства ў галіне абарачэння стойкіх арганічных забруджвальнікаў, экалагічна бяспечнае захоўванне і абясшкоджванне адходаў з утрыманнем САЗ, выяўленне і ачыстка ад САЗ тэрыторый, маніторынг навакольнага асяроддзя і стану здароўя насельніцтва ў сувязі з уздзеяннем САЗ, скарачэнне і спыненне выкідаў асабліва шкодных хімічных рэчываў, удасканаленне сістэмы іх уліку, абмен інфармацыяй з сакратарыятам і бакамі Стакгольмскай канвенцыі, інфармаванне грамадскасці па пытаннях у гэтай сферы, — падкрэслівае намеснік начальніка ўпраўлення абыходжання з адходамі — начальнік аддзела рэгулявання Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Вольга Сазонава. — Так,

Лечымся без лекаў

СУПРАЦЬ АЦЁКАЎ — АГУРОК І БРУСНІЦЫ

Ацёкі — даволі распаўсюджаная з'ява, асабліва ў жанчын. Але многія лічаць іх толькі касметычнай праблемай, якая ўзнікае ў выніку ўжывання вялікай колькасці вадкасці. Між тым, існуе мноства прычын з'яўлення ацёкаў і не ўсе яны бяскрыўдныя...

ЁСЦЬ 5 ПРОСТЫХ ПРЫКМЕТ, ЯКІЯ ДАПАМОГУЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЬ, ЦІ СХІЛЬНЫЯ ВЫ ДА АЦЁКАЎ:

- Пярсцёнкі напрыканцы дня цяжка зняць з пальцаў.
- Вечарам складана абуваць туфлікі, асабліва любімыя.
- На нагах застаюцца сляды ад гумак шкарпэтак.
- Набор вагі без бачнай прычыны — быццам бы няшмат еў, а вага расце. Гэта лішняя вада. Сэрца і ныркі не спраўляюцца.
- Калі добранька націснуць пальцам на мяккія тканкі нагі і патрымаць крыху, а пасля адпусціць, застаецца ямка, якая доўга праходзіць.

Гэта ўсё сведчыць пра тое, што ў арганізме назапашваецца непатрэбная вада, якая выклікае шэраг хваравітых з'яў.

ЯК З ГЭТЫМ ЗМАГАЦЦА? Па-першае, з дапамогай дыеты. Пры схільнасці да ацёкаў выбірайце прадукты (лепш агародніну), якія спрыяюць вывядзенню вады з арганізма. Ешце журавіны, ягады шыпшыны, глогу — яны падтрымліваюць работу сэрца. Калі ў вас з'яўляюцца ацёкі, ні ў якім разе не пераядайце, харчуйцеся дробнымі порцыямі 4—6 разоў на дзень. Карысныя таксама і кісламалочныя прадукты. Памятайце, што апошні прыём ежы павінен быць за 3—4 гадзіны да сну. Добра і пагаладаць — прыкладна раз на тыдзень. Галаданне выдатна выводзіць лішнюю ваду з арганізма.

УВАГА! Народная медыцына прапануе вялікую колькасць рэцэптаў, якія змяншаюць ацёкі і аблягчаюць стан хворага, але ўсё ж прымяняць іх рэкамендуецца пасля кансультацыі з лечачым урачом.

- Агурочны сок — прыроднае мачагоннае. Прымайце па 1 шклянцы са сталовай лыжкай мёду 2—3 разы на дзень да яды.
- Узяць па 1 ст. лыжцы пладоў глогу, рабіны чырвонай, шыпшыны. Можна дадаць (калі ёсць) каліну, курагу. Дабавіць разынкі і заліць літрам кіпеню. Настойваць ноч. Піць на працягу дня як звычайную гарбату.
- Адвар з маладой ігліцы. Вазьміце 5 ст. лыжак ігліцы (падыдзе любая — елка, сасна, піхта). Заліце 0,5 л кіпеню. Настойвайце ноч і прымайце па паўшклянкі 4—5 разоў на дзень.
- Вазьміце цыбулю-рэпку — 2 штукі сярэдняга памеру. Нарэжце кольцамі, засыпце цукрам, пакіньце на ноч. На наступны дзень піце атрыманы сіропчык па 2 ст. лыжкі. Ён будзе дзейнічаць як мачагонны сродак.
- Прыгатуйце настой з бруснічніку (1 частка), кукурузных рыльцаў (1 частка), лісця бярозы (1 частка): сталовую лыжку збору заварыце шклянкай кіпеню, настойвайце 20—30 хвілін, працадзіце. Прымайце па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень у якасці мачагоннага сродку.
- 2 ч. лыжкі сумесі ягад і лісця брусніц заварыць шклянкай крутога кіпеню і кіпяціць 3 хвіліны, патрымаць пад накрыўкай 15 хвілін, працадзіць. Прымаць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень.
- 2 ст. лыжкі насення лёну заліваем 0,5 літра халоднай вады. Кіпяцім на працягу 15 хвілін, накрываем і ставім у цёмнае месца. Пасля таго, як настой пастаяў, дадаём 1 ст. лыжку лімоннага соку. П'ём па паўшклянкі на працягу дня. Курс — тыдзень.
- Для зняцця ацёкаў ног можна выкарыстоўваць часнок. Галоўку часнаку здрабніце, заліце шклянкай кіпеню. Астуджанай кашкай натрыце ацёклыя месцы, а праз 30 хвілін змыйце халаднаватай вадой.
- Ванначка супраць ацёкаў пры хваробах артэрый. Спосаб прыгатавання: напоўніце ванну цёплай вадой (10 л), дадайце яблычны воцат (2 шклянкі). Працэдуру лепш праводзіць на ноч перад сном. Ванну прымайце на працягу 15 хвілін, затым дайце нагам высахнуць на паветры. Пасля варта надзець баваўняныя шкарпэткі.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Ракаў чакаюць лёсавызначальныя сустрэчы, Львоў — падарунак лёсу

ВАЕН. Могуць узнікнуць няпростыя сітуацыі. Вас можа адолець бурны запал, прычым адразу да некалькіх людзей. Верагодная фінансавая залежнасць ад партнёра або ўстановы. Будзьце гатовыя адказаць за свае словы і ўзятыя на сябе абавязацельствы. Цалкам верагодна, што найлепшай схемай дзеянняў будзе спантаннасць. Можаце не напружвацца, усё складзецца само сабой. У справах пажадана прытрымлівацца сваіх планаў, нават калі вам давядзецца разлічваць толькі на свае сілы.

ЦЯЛЕЦ. Можа рэзка ўзрасці ваша актыўнасць, што станоўча адаб'ецца на ўсіх справах. Для таго, каб больш паспяхова спраўляцца з праблемамі, паспрабуйце загадзя скласці план дзеянняў. Зараз гэта неабходна вам як ніколі. У панядзелак пажадана пазбягаць мітусні. Дзень спрыяльны для пачатку доўгатэрміновых праектаў. Паспрабуйце быць больш уважлівымі і праявіце практычнасць. Калі ваша праца звязаная з інфармацыяй — уважліва правярайце ўсё, што да вас паступае.

БЛІЗНЯТЫ. Эгацэнтрызм — не ваш стыль. Вы, зразумела, заслугоўваеце ўсялякіх пахвал, але не варта займацца выключна самалюбаваннем. Агледзьцеся: раптам камусьці з вашага асяроддзя патрэбна дапамога. У панядзелак не варта выхоўваць навакольных людзей, калі не хочаце патрапіць у эпіцэнтр іх эмоцый. Не зацягвайце з вырашэннем праблем у сераду: у гэты дзень кожная дробязь, адкладзеная на заўтра, стане непад'ёмным грузам пасля.

РАК. Звядзіце да мінімуму магчымыя кантакты з прадстаўнікамі падатковых і фінансавых органаў — гэта дапаможа пазбегнуць вельмі буйных непрыемнасцяў. Верагодныя перапады настрою, якія могуць прывесці да творчага крызісу. Цяпер не проста будзе ажыццявіць свае праекты. У аўторак, асабліва ў другой палове дня, паспрабуйце не пачынаць новых спраў, лепш як след адпачніце. Паспрабуйце не ідэалізаваць мінулае: сустрэча са старымі сябрамі — гэта толькі даніна ўспамінам. Памятайце, што напярадзе вас чакаюць лёсавызначальныя сустрэчы.

ЛЕЎ. Зможаце падвесці вынік, хоць бы і прамежкавы. Альбо вас прымусяць гэта зрабіць. Лёс падарыць шанц — магчыма, гэта будзе новая праца або магчымасць памяняць месца жыхарства. У любым выпадку набудзеце штосьці каштоўнае для сябе. У панядзелак змена іміджу дазволіць паказаць сябе навакольным з выйгрышнага боку. У чацвер будзьце асцярожнымі з навінамі — не ўсім варта верыць.

ДЗЕВА. У панядзелак будзьце асцярожнымі — у пагоні за выгадай можна прагледзець доўгатэрміновы перспектыўны кантракт. У сераду будзьце больш акуратнымі, маючы справу з лічбамі і дакладнымі разлікамі. Пачынаючы з чацвярга, перад вамі могуць адкрыцца бліскучыя магчымасці. Надыходзіць спрыяльны час для вучобы і кар'еры. У нядзелю можа пачацца адзін з самых рамантычных перыядаў гэтага года.

ШАЛІ. Знойдзеце новыя месцы прыкладання сваіх сіл. Кантакты і вучоба будуць не толькі вельмі карысныя — яны прынясуць радасць. Паспрабуйце знаходзіць нестандартныя рашэнні пытанняў — тым больш што менавіта цяпер будзе добра працаваць лагічнае мысленне. Не паддавайцеся паніцы з-за часовых цяжкасцяў. Калі нешта не будзе атрымлівацца, звярніцеся да блізкіх людзей за парадай і дапамогай.

СКАРПІЁН. Пачынаючы з панядзелка, настройцеся на дзеянні, якія будуць накіраваныя на перабудову жыцця на новы, больш высокі ўзровень. Пачынайце паступова вучыцца таму, чаго вам не хапае. У чацвер варта падрыхтаваць сябе да неспадзёвак, бо ў гэты дзень Фартуна можа звярнуць на вас увагу. У канцы тыдня даўнія мары нарэшце пачнуць ажыццяўляцца — дзякуючы цярпенню і стараннасці, памножаным на працаздольнасць.

СТРАЛЕЦ. Можа з'явіцца магчымасць заняцца новым відам дзейнасці. Неабходна рэалістычна паглядзець на некаторыя рэчы і, магчыма, прыняць часам нават не зусім прыемныя рашэнні. У сераду і чацвер паспрабуйце не ствараць сабе праблем, лічачы любую дробязь непераадольнай перашкодай. Паспрабуйце засяродзіцца на тым, што датычыцца вашых інтарэсаў, і адагнаць ад сябе назойлівыя думкі, якія пастаянна адцягваюць увагу.

КАЗЯРОГ. Занятасць на працы зберажэ вас ад здзяйснення непрадуманых учынкаў. Не выключана, што здолееце ўрваць гадзінку-другую на глупствы, але лепш усё ж прысвяціць іх плённай працы. Няпроста цяпер будзе займацца справамі, для вас нязвыклымі. Ад вас запатрабуецца поўная мабілізацыя, уменне хутка цяміць і не менш хутка дзейнічаць.

ВАДАЛЕЙ. Паспрабуйце быць больш уважлівымі — пастарайцеся не рабіць памылак, каб калегі не абвінавацілі вас ва ўсіх смяротных грахах. Пачынаючы з серады, будзеце думаць на рэдкасць выразна і ясна. Гэта будзе спрыяць зараджэнню мноства ідэй, якія пажадана падзяліць на рэальныя і ілюзорныя. Вам неабходныя надзейнасць і дзелавая хватка, якія дазваляюць паспяхова супрацьстаяць апанентам у любой сітуацыі.

РЫБЫ. Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на дысцыпліну, бо, напрыклад, спазненні могуць нашкодзіць вашай ідэальнай рэпутацыі. Вялікага поспеху можна дабіцца, працуючы ў калектыве з актыўнымі людзьмі. У панядзелак будзьце асцярожнымі: у гэты дзень вы можаце стаць выдатным аб'ектам для плётак. У аўторак можаце разлічваць на падтрымку сяброў. У сераду лепш не абмяркоўваць новых ідэй з начальствам. Магчыма прапанова працы, звязанай з далёкімі паездкамі.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (26 жніўня). Па гарызанталі: Навальніца. Ровар. Цана. Сага. Ідал. Маяк. Вясёлка. Юрта. Спа. Фас. Тавар. Мянтуз. Сал. Знак. Альфа. Абеліск. Галкіпер. Амаці. Час. Мэр. Кіт. Палітра. Адвар. Якар. Горын. Асака. Луг. Ямал. Парасон.

Па вертыкалі: Хмара. Чад. Горан. Вега. Ласка. Мафусаіл. Іронія. Аза. Скіт. Нара. Лекі. Ягада. Онікс. Пракос. Вывад. Арал. Ава. Прыкуп. Руля. Нага. Соты. Аул. Злом. Лівень. Амт. Афіцэр. Бэра. Рука. Іракліён.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

УТУЛЬНЫ ДОМ

Усё па палічках

Калі ёсць пустая сцяна — значыць, у яе трэба ўбіць цвік. А яшчэ лепш павесіць арыгінальныя паліцы. Прапаноўваюцца ідэі!

МАРА МЕЛАМАНА

Кусок сцяны паміж вокнамі выклікае супярэчлівыя пачуцці. Хочацца яго выкарыстаць, але сюды нічога толкам не паставіш. Звычайна яго закрываюць шторамі, але ёсць і іншае рашэнне. Сцяну можна пафарбаваць ў яркі колер, побач, на нізкай падстаўцы, размясціць аудыёцэнтр, а над ім павесіць лёгкія паліцы для дыскаў. Гэтыя паліцы выраблены з фанеры, ім нададзена вытанчаная выгнутая форма. Жыццярадасны фон, таршэр і мяккае крэсла — што яшчэ трэба для таго, каб адчуць асалоду ад музыкі!

У КУЦЕ ЗА ДЗВЯРАМІ

Калі ў кватэры ёсць пусты кут, не трэба ставіць туды дзіця, якое правінілася. У куце можна размясціць шэраг паліц, выкарыстаных з металічнага ліста. Такому лісту нескладана надаць патрэбную форму, да таго ж ён досыць лёгкі. Метал можна афарбаваць метадам напылення ў яркі жоўта-зялёны колер. На дно адных секцый можна пакласці фетравыя падсцілкі, для другіх зрабіць драўляныя накладкі. Тут знойдуць сваё месца сумкі, абутак, тэлефон і іншыя патрэбныя рэчы.

ГУЛЬНЯ Ў ХОВАНКІ

Незразумела, якая чарадзейная сіла ўтрымлівае стосы кніг на сцяне. Адкрыем сакрэт: яны ляжаць на паліцах. Аднак гэтыя паліцы практычна немагчыма адрозніць ад саміх тамоў, паколькі ў іх такая ж форма і «абаронная афарбоўка». Выраблены паліцы з дошак (дрэва лепш утрымлівае элементы крапяжу), а для камуфляжу спатрэбіліся старыя супервокладкі. Наклееныя карэньчыкамі да гледача, яны палягчаюць пошук, пазначаючы тэму стоса (ежа, садоўніцтва, фотаальбомы).

НА АДНОЙ НАЗЕ

Ізноў праблема кутоў. Гэтым разам у куце гасцінай змясцілі канструкцыю з вертыкальнай металічнай стойкі і некалькіх прамавугольных скрыняў. Паліцы «нанізаныя» на апору, як на прут. А каб яны не саслізгвалі ўніз, іх зафіксавалі адмысловымі крапежнымі элементамі, якія, зрэшты, дазваляюць скрыням круціцца. У выкарыстанні такой канструкцыі ёсць некаторыя абмежаванні. Яе нельга ўсталяваць у пакоі з нацяжнымі столямі. Бо стойку трэба цвёрда замацаваць паміж падлогай і столлю.

-2682-

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

З чым трэба піць чай?

Ці такі шкодны чай з цукрам? Што карыснага ў спалучэнні чаю з лімонам і малаком? Якія дабаўкі ўзмацняюць, а якія памяншаюць лекавыя ўласцівасці напою?

1. ЦУКАР

Чай з цукрам паказаны пры стрэсах і нервовым знясільванні, а таксама тым, хто адчувае недахоп вітаміну B_1. Да таго ж, дабаўленне невялікай колькасці цукру дазваляе паўней раскрыцца смаку чайнага настою (а вось вялікія дозы цукру, наадварот, заглушаюць яго). Адэкватнымі заменнікамі цукру могуць стаць разынкі або мёд.

2. МУЧНОЕ

Пірожныя, печыва, бутэрброды запівайце толькі моцным чаем — ён дапамагае органам стравання пераварыць цяжкую ежу, а заадно павышае яе пажыўнасць.

Пры ўжыванні ж мучных вырабаў са слабым чаем адмоўнае ўздзеянне гэтых прадуктаў на наш арганізм павялічваецца ўдвая. Нагружаючы яго вугляводамі і адначасова вялікай колькасцю перагатаванай вады, мы стваraем залішнюю нагрузку на розныя органы, у тым ліку на сэрца і сістэму кровазвароту.

Аказваецца:

Еўрапейскі звычай падсалоджваць чай з'явіўся толькі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя, праз 300 гадоў пасля з'яўлення напою. Тады дадаць цукар у гарбату вырашылі па аналогіі з... какавай.

3. МАЛАКО

Чай з малаком — у вышэйшай ступені пажыўны і лёгка засваяльны напой, які валодае стымулюючымі ўласцівасцямі. Малако — прадукт, у хімічны склад якога ўваходзіць больш за сто розных рэчываў, неабходных арганізму. Пры гэтым яно не вельмі добра ператраўляецца страўнікам. І чай якраз паляпшае засваенне малака, а заадно ўзбагачае яго раслiннымі тлушчамі і вітамінамі. У сваю чаргу малако таксама «дапамагае» чаю: яно змякчае дзеянне кафеіну і іншых алкалоідаў.

Моцны чай з малаком асабліва карысны з раніцы або пасля напружанага дня. Ён надае сіл, паказаны пры хваробах нырак і сэрца, для ўмацавання цэнтральнай нервовай сістэмы.

Як правільна прыгатаваць чай з малаком?

Для гэтага падыходзіць як чорны, так і зялёны чай, а таксама іх сумесь. З-за змякчальных уласцівасцяў малака колькасць сухой заваркі трэба павялічыць. Малако не кіпяціць, а падаграваюць да 40-60 °С.

4. ЛІМОН

Дабаўленне лімона натуральным чынам узмацняе лекавыя ўласцівасці чаю. Асвятленне ж чаю, якое адбываецца ад скрыліка лімона, зусім не значыць паніжэнне яго моцнасці. Ад прысутнасці лімона і іншай садавіны ў напоі змяняецца толькі яго колер і смак. Сапраўдныя знаўцы чаю не дадаюць лімон, лічачы, што ён цалкам «забівае» спецыфічны чайны водар.

Аказваецца:

Дабаўленне лімона ў чай — чыста рускае вынаходства. Як запэўнівае В.В. Пахлёбкін, да 80-х гадоў XIX стагоддзя нікому нідзе ў свеце не прыходзіла ў галаву злучыць чай і лімон у адным напоі. Корчмы і рэстараны хутка ўзялі на ўзбраенне гэты купецкі рэцэпт, увёўшы яго ў шырокі ўжытак.

5. СПЕЦЫІ

Духмяны чай са спецыямі ацэняць тыя, хто шукае новыя смакавыя адчуванні. Паспрабуйце дадаць у чай карыцу, кардамон, гваздзіку, мускатны арэх. Аднак будзьце асцярожныя: чай з рэзкімі спецыямі — гэта моцнадзейны стымулюючы напой, якім не варта злоўжываць.

Самымі бяскрыўднымі спецыямі з'яўляюцца духмяны перац (зярнятка трэба раздушыць перад тым, як пакласці ў заварачны чайнік), мята, кмен, мацярдушка, імбір.

-2683-

СЁННЯ

Месяц

Поўня 24 жніўня.
Месяц у сузор'і Авена.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.10	20.10	14.00
Віцебск —	5.57	20.03	14.06
Магілёў —	6.00	20.00	14.00
Гомель —	6.00	19.54	13.54
Гродна —	6.26	20.25	13.59
Брэст —	6.30	20.22	13.52

Імяніны

Пр. *ПРАЧЫСТАЯ (Успенне Багародзіцы).*

К. *Патрыцыі, Аляксея, Аляксандра, Аўгустына.*

Фота Валерыя КАВАЛЕНКА.

Дзве даты

28 жніўня

1874 год — нарадзіўся (г. Вілейка) Аляксандр Уласаў, вядомы беларускі грамадскі і культурны дзеяч, публіцыст, выдавец. Адзін з заснавальнікаў беларускага выдавецкага грамадства «Наша хата» ў Вільні. Удзельнічаў у друкаванні беларускіх календароў, кніг Я. Коласа, М. Багдановіча, Э. Ажэшкі і інш. Арганізатар і адзін з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы. У 1922-29 гадах пад яго апекай дзейнічала Радашковіцкая беларуская гімназія імя Ф. Скарыны. Аўтар артыкулаў «Пра ткацтва ў Беларусі», «Што думае народ пра школы», «Пра дарогі ў Беларусі» і інш. Пісаў пра развіццё харчовай прамысловасці, апублікаваў эканамічны нарыс «Беларусь. Літва». У 1939 годзе рэпрэсаваны. Памёр у 1941-м. Рэабілітаваны ў 1961 годзе.

1963 год — каля мемарыяла Лінкальна ў Вашынгтоне вядомы змагар супраць расавай дыскрымінацыі Марцін Лютэр Кінг выступіў з палымянай прамовай «У мяне ёсць мара», у якой ён выклаў сваё бачанне будучага, дзе белыя і чорныя грамадзяне маглі б жыць як роўныя.

Цытата дня:

«Што б пра цябе не казалі, рабі тое, што лічыш справядлівым. Будзь аднолькава раўнадушным і да крытыкі, і да пахвальбы».

Піфагор Самоскі (VI ст да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

29 ЖНІЎНЯ — ТРЭЦІ СПАС (МАЛЫ СПАС, ХЛЕБНЫ, АРЭХАВЫ СПАС)

Калі жоравы адлятуць да Трэцяга Спаса, то на Пакровы (14 кастрычніка) чакай маразоў; калі ж не — зіма будзе пазней.

Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе.

- Гэты дзень у народзе атрымаў назву Трэці (па ліку) Спас. Акрамя таго, гэта яшчэ і Хлебны, Арэхавы Спас, Спас на палатне, Спас на халсце. У народзе казалі: «Першы Спас (14 жніўня) — на вадзе стаяць, другі (19 жніўня) — яблыкі ядуць, трэці (29 жніўня) — халсты прадаюць». Ці так: «Трэці Спас хлеба назапасіў».
- Да гэтага дня сяляне імкнуліся скончыць адбельванне палатна, пасля чаго яго асвячалі святой вадой, і толькі пасля гэтага дазвалялася выкарыстоўваць яго ў гаспадарцы ці прадаваць.
- Таксама свята носіць назву Хлебны Спас. Галоўнай асаблівасцю гэтага дня было выпяканне хлеба, караваяў, пірагоў, для якіх выкарыстоўвалася толькі мука новага ўраджаю.
- Каб атрымаць бласлаўленне звыш, у гэты дзень паўсюдна часцавалі пірагамі «божых» людзей — бедных, хворых, юродзівых і інш.
- У шматлікіх рэгіёнах Беларусі менавіта на Хлебны Спас ладзілі дажынкі — свята заканчэння жніва, а таксама «хлебную» талаку.
- Спас Арэхавы — яшчэ адна назва гэтага дня. У гэты час паспяваюць арэхі. На досвітку, нягледзячы на дрэннае надвор'е, неабходна было абавязкова схадзіць у лес і назбіраць крыху арэхаў, каб асвяціць у храме.
- У гэты час адлятаюць у вырай апошнія ластаўкі. У народзе заўважалі: «Ластаўкі адлятаюць у тры Спасы, жоравы — да трэцяга Спаса».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

— Сёма, як прайшлі шашлыкі?
— Звычайна.
— А што за дзеўку ты там займеў? Сімпатычная?
— Больш не п'ю.

☺

Вучань піша сачыненне ў школе на тэму «Мой тата»:

«Мой тата самы моцны, спрытны і адважны! Ён можа пераплысці самую бурную і шырокую раку, якая кішыць кракадзіламі, без страхоўкі залезці на самую стромкую і высокую гару і галаруч падужаць лютага мядзведзя або нават тыгра... Але звычайна ён пыласосіць, гатуе вячэру і мые бялізну».

☺

Муж — жонцы ў ложку:
— Дарагая, ты будзеш спаць або ў цябе сумленне ёсць?

☺

Карты — азартная, захапляльная гульня, якая дазваляе згубіць час, грошы і сяброў.

☺

— Чаму суседзі зверху заўсёды такія ідыёты?
— Спытайся пра гэта суседа знізу...

Віншую дарагую матулю **Рыму Дзмітрыеўну ГАНЧАРОВУ** з днём нараджэння. Жадаю шчасця, здароўя.

Сын Саша.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4203 Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12